■ Спорт-тайм

Паўфінальная класіка:

Лацінская Амерыка супраць Старога свету

FIFA WORLD CUP Brasil

У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра трыумфатараў Уімблдона, буйныя перамогі «Мінска» і БАТЭ, а таксама анансуе сённяшнія матчы футбольнага мундзіялю.

1. **У паўфіналах чэмпіянату свету** сустрэнуцца па дзве каманды ад Лацінскай Амерыкі і Еўропы. У першым чвэрцьфінале зборная Германіі перайграла французаў. Ранні гол Матса Хумельса, забіты на 13-й хвіліне, так і застаўся адзінай рэзультатыўнай атакай у матчы. І хаця ў канцоўцы сустрэчы французы нядрэнна прэсінгавалі і нават мелі некалькі шыкоўных момантаў, параўняць лік у «трохкаляровых» не атрымалася. У паўфінале «бундэнсманшафт» сустрэнецца з бразільцамі, якія аказаліся мацнейшымі за калумбійцаў (2:1). Аднак сёння гаспадары мундзіялю выйдуць на поле без свайго лідара. У выніку сутыкнення з калумбійцам Хуанам Суньігам Неймар атрымаў сур'ёзную траўму і выбыў да канца турніру.

Аргенцінцы, як і немцы, прайшлі ў паўфінал дзякуючы ранняму голу (1:0). У «нябесна-блакітных» у матчы супраць бельгійцаў адзначыўся Гансала Ігуаін. Адзначым, што і аргенцінцы панеслі страты: у чвэрцьфінальнай сустрэчы Анхель ды Марыя атрымаў разрыў падкаленнага сухажылля і наўрад ці зможа дапамагчы сваёй камандзе. Зрэшты, сам футбаліст спадзяецца яшчэ выйсці на поле... у фінальным матчы. Сапернікамі трохразовых чэмпіёнаў свету сталі галандцы, якія толькі ў серыі пенальці перайгралі костарыканцаў. Які фінал чакае футбольных балельшчыкаў — лацінаамерыканскі, еўрапейскі ці змешаны? Убачым — чакаць засталося нядоўга.

2. Мінскае «Дынама» перайграла «Гомель» (1:0) і першым забяспечыла сабе месца ў першай шасцёрцы. Героем сустрэчы стаў Эрнан Фігерэда, які на 34-й хвіліне забіў у вароты Андрэя Клімовіча. Дзякуючы гэтай перамозе «бела-сінія» зноў перахапілі лідарства ў БАТЭ. **У шаснаццатым туры беларускага чэмпіянату** барысаўчане перайгралі брэсцкае «Дынама» з буйным лікам — 4:0. Дублем адзначыўся Віталь Радзівонаў. З такім жа лікам скончылася і сустрэча «Мінска» з «Нафтанам». «Гараджане» літаральна разграмілі новапалачан на гасцявой арэне. Дубль на рахунку Аляксандра Макася. Адзначым і астатнія вынікі: з аднолькавым лікам 1:0 у сваіх матчах перамогу атрымалі «Шахцёр», «Слуцк» і «Тарпеда-БелАЗ», перайграўшыя адпаведна «Дняпро», «Белшыну» і «Нёман».

3. Максім Мірны ў пары з тайванскай тэнісісткай Чжань Хаацын саступілі ў фінале мікста **на Уімблдонскім турніры.** У паўфінале беларуска-тайванскі тандэм перайграў леташніх чэмпіёнаў Уімблдона — Крысціну Младзенавіч/Даніэля Нестара. А вось у вырашальным матчы, на жаль, не атрымалася справіцца з аўстралійска-сербскай парай Саманта Стосур/Ненад Зіманіч — 4:6, 2:6. Дарэчы, фінальны матч Максім Мірны праводзіў у свой 37-ы дзень нараджэння.

У жанчын пераможцай турніру стала чэшка Петра Квітава, якая ў фінале менш чым за гадзіну перайграла канадку Эжэні Бушар. А вось у мужчын паядынак за трафей доўжыўся амаль што чатыры гадзіны. Сербскі тэнісіст Новак Джокавіч у пяці сетах адолеў швейцарца Роджэра Федэрэра. Для абодвух трыумфатараў гэтага года тытул на Уімблдоне стаў другім у кар'еры. Гэтак жа сінхронна Квітава і Джокавіч перамагалі ў Лондане тры гады таму.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

Анхель ды Марыя паабяцаў аднавіцца да фіналу. Але ці будзе там яго каманда?

Усходні гараскоп на тыдзень

АВЕН. У пачатку тыдня ініцыятыва і актыўнасць могуць аказацца нясвоечасовымі, таму ў гэтыя дні нічога сур'ёзнага лепш не планаваць. Калі вам прапануюць звышурочную працу, не адмаўляйцеся, але перад згодай рэальна ацаніце свае магчымасці — гэта не будзе лішнім. Сачыце за развіццём сітуацыі на працы больш старанна: не выключана, што вас могуць падставіць.

ЦЯЛЕЦ. Паспрабуйце не прапусціць удалы выпадак, бо дзякуючы старым сувязям з'явіцца рэальны шанц рэалізаваць свае планы. Варта быць асцярожнымі падчас сустрэч і перамоў: існуе небяспека дробных хітрасцяў. Досціп і красамоўства, а таксама здольнасць лёгка і зразумела выказваць думкі, дазволяць вам пакарыць усіх сваім талентам апавядальніка.

БЛІЗНЯТЫ. Не варта здзяйсняць гераічных учынкаў: іх проста не ацэняць. Лепш займіцеся назапашанымі дробнымі праблемамі. Першая палова тыдня можа абрынуць на вас паток сустрэч, званкоў і папяровай працы. Магчымы таксама клопаты, звязаныя з арганізацыйнымі мерапрыемствамі.

РАК. Цалкам верагодна, што вы адкрыеце для сябе новыя сферы дзейнасці, а гэта пацягне за сабой знаёмства з людзьмі, якія стануць для вас і партнёрамі, і сябрамі. Падобныя перамены будуць у радасць, бо мернае жыццё стала патроху надакучваць. Не ігнаруйце меркаванне навакольных, бо менавіта яно дазволіць зрабіць каштоўныя высновы, неабходныя для рэалізацыі ідэй.

ЛЕЎ. Вельмі ўдалы тыдзень. Не адмаўляйцеся ад паездак: яны акажуцца выніковымі. Захапляцца містыкай і разгадваннем чужых сакрэтаў цяпер не варта — гэта можа прывесці да плётак і інтрыг вакол вас. Чацвер дасць вам магчымасць разбурыць старое і вызваліць месца для стварэння новага. У гэты дзень добра закладваць аснову для вялікіх спраў.

ДЗЕВА. Надыходзіць перыяд напружанай працы. Вам трэба будзе мабілізаваць усе свае сілы і магчымасці для рашучага рыўка. Не спыняйцеся і не звяртайце ўвагі на дробныя няўдачы: яны ніяк не змогуць паўплываць на поспех. Навакольныя зараз будуць вельмі добразычліва ставіцца да любых вашых пачынанняў, тым не менш варта быць больш пераборлівымі ў стасунках.

ШАЛІ. Не прыспешвайце падзеі, інакш не зможаце аб'ектыўна разлічыць свае сілы. Знайдзіце час для вырашэння старых праблем. У гэтым вы можаце разлічваць на дапамогу сяброў і блізкіх. Магчымая цікавая дзелавая сустрэча, якая ўнясе ў ваша жыццё значныя змены.

СКАРПІЁН. Будзьце гатовы праявіць выключную вытрымку і такт у гутарках з начальствам, падчас дзелавых нарад і пры сустрэчах з калегамі па працы. Калі здолееце зрабіць гэта, то вас будзе чакаць поспех: паступяць выгадныя перспектыўныя прапановы, з'явяцца ўплывовыя знаёмыя.

СТРАЛЕЦ. Давядзецца папрацаваць на працягу ўсяго тыдня, але справы ўсё роўна будуць прасоўвацца павольна. Варта звярнуць увагу на некаторыя свае недахопы і, па магчымасці, іх выправіць. Так вы зможаце пазбегнуць многіх непрыемнасцяў. Паспрабуйце знайсці агульныя інтарэсы з блізкімі людзьмі і арганізуйце сумесны адпачынак у выхадныя.

КАЗЯРОГ. На гэтым тыдні ў сітуацыі, якая склалася, пазіцыя сілы працаваць не будзе, а толькі справакуе незадаволенасць або канфліктную сітуацыю, так што дадайце пабольш дыпламатычнасці і гнуткасці ў прыняцце рашэнняў. Прыслухайцеся да голасу ўласнай інтуіцыі, і вы набудзеце ў асобе партнёраў сапраўдных аднадумцаў. Не ігнаруйце дробязі, і тады яны адкрыюць вам вельмі шмат карыснага і цікавага. Бліжэй да канца тыдня верагодныя добрыя весткі з-за мяжы.

ВАДАЛЕЙ. Праяўляючы на гэтым тыдні такія якасці, як паблажлівасць і цярпенне, вы толькі выйграеце: вашы кар'ерныя памкненні знойдуць адлюстраванне ў выглядзе першых станоўчых вынікаў. Хоць тыдзень больш прыдатны для адпачынку, тым не менш у гэты час можна заняцца і любімай справай. Ваша прадбачлівасць дазволіць пашырыць гарызонты магчымасцяў. Паспрабуйце спакойна выслухаць прэтэнзіі з боку блізкіх людзей і знайсці аптымальнае выйсце з сітуацыі, якая склалася.

РЫБЫ. Памылкі здзяйсняюць усе, але мудрасць жыцця заключаецца ў тым, каб не паўтараць іх і не рухацца па замкнёным коле, а здабываць з цяжкасцяў пазітыўны вопыт. Гэта і ёсць для вас асноўная задача тыдня. Калі нешта не атрымалася з першага разу, паспрабуйце яшчэ і яшчэ раз, але ідзіце іншым шляхам, звярніцеся па параду да вашага мудрага дарадцы і настаўніка. Не сумнявайцеся: ён знаходзіцца дзесьці зусім побач.

КОТКА Ў МЯШКУ

Школа ў вёсцы Мілашова Мёрскага раёна была адкрыта ў пазамінулым стагоддзі (будынак яшчэ і цяпер красуецца над возерам). А ў сярэдзіне трыццатых мінулага — настаўнікам там (ці як тады казалі, «кіроўнікам»), працаваў Станіслаў Любаньскі. Высокі, хударлявы, з моднымі маленькімі вусікамі. Ад вучняў ён, мякка кажучы, патрабаваў (прычым — не грэбуючы лінейкай... І біў, не шкадуючы!), каб тыя размаўлялі выключна па-польску.

Але ж, дзякуючы Богу, дзеці свайго настаўніка не вельмі слухалі і такім чынам захавалі матчыну мову да хрушчоўскай нацыянальнай палітыкі, да сучасных нашых часоў.

Зрэшты, пра школу. У ёй тады былі два вялікія пакоі для вучняў і два такія ж (плюс кухня) — для пана Станіслава. Прыбірала ва ўсіх чатырох (а заадно і кухарыла) увішная кабета па імені Мальвіна. Яна ж часам ушчувала настаўніка, што жыве халасцяком, а між тым нявест у ваколіцах — якіх толькі хочаш! Выбірай.

Аднак да тутэйшых дзевак імпэту ў пана чамусьці не было: ён сабе дзесь у свеце яе адшукаў праз службу знаёмстваў (была такая ў Польшчы), распачаў ліставанне і вось...

Едзе яна!

Пан настаўнік наняў брычку — падаўся на станцыю сустракаць. Мальвіна ж з самага ранку шчыравала ў пакоях. Увесь спрыт уклала ў прыбіранне (з дому вышываначак сваіх нанесла) ды ў падрыхтоўку стала. «Усё, можна хоць каралеву прывозіць!» — прамовіла нарэшце, сеўшы адпачыць. А тут, глядзіш, і фурманка пад'ехала: пан Станіслаў саскочыў з брычкі, падаў руку высокай жанчыне.

— Худаватая нешта, — зазначыла пра сябе кухарка, — але ж нічога, адкормім.

Між тым кандыдатка ў нявесты, абмыўшы дарожны пыл, выйшла да стала, на якім красавалася бутэлька добрага віна з прыгожымі фужэрамі, талеркі з закускамі. Мальвіна ўзялася падносіць іншыя прысмакі...

Вячэра падыходзіла да свайго завяршэння. Пан Станіслаў прапанаваў госці прагуляцца да вады, пакатацца на лодцы.

Тая, аднак, прапанову адмяла: сказала, што хоча легчы. А перад тым (у пана вочы на лоб!) сама сабе наліла віна і... стала распранацца.

Пан быў збянтэжаны! Ён зніякавеў і як падсмалены даўся ў дзверы. Тут жа пайшоў да суседа, папрасіў, каб той адвёз «нявесту» назад на станцыю, ды перадаў ёй на словах, што ўсё, кропка — аніякіх стасункаў паміж імі быць не можа, бо... падманула яна: у пісьмах малявала сябе юнай «дзевэчкай», сціплай і цнатлівай, а наяве аказалася...

Так што служба службай (як казалі потым вяскоўцы пра тую службу знаёмстваў) і ліставанне ліставаннем, а нявесту лепш шукаць самому.

Ці зразумеў гэта пан Станіслаў, гісторыя замоўчвае, бо ў хуткім часе ён з'ехаў з Мілашова, змяніў школу.

Альфрэд Тычко,
в. Ідолта, Мёрскі раён.

ПОМСТА

Хто не ведае, як у спякотны дзень дакучаюць мухі, сляпні, авадні... І, вядома ж, не толькі людзям. Цяжкі гэта час для жывёлы: у пяць хвастоў не абаронішся. А калі ён адзін? І ногі спутаны... І на шыі ланцуг? І гаспадар, як на ліха, спазняецца...

То будзе яму, як таму каню! Не верыце? Тады слухайце.

Дзядзька Павел (назавём яго так) прамаргаў неяк раз — запазніўся на пашу, каб забраць каня. А лета, гарачыня... Як той бедны Каштан і вытрымаў!

Але ж нарэшце прыждаў — з'явіўся гаспадар. Каб хутчэй было, адвязаў каня, распутаў, ускочыў яму на спіну. Конь тут жа ў бок канюшні, з усіх чатырох — куляй дамчаў. Вось ужо і будынак віднеецца, дзверы насцеж расчынены.

— Т-р-р! — загадзя крычыць гаспадар. — Стой, халера на цябе!

А Каштан — каб вухам павёў...

І ўсё б, можа, нічога яшэ, калі б дзвярны праём у канюшні быў высокі, а так...

Як ні гнуўся дзядзька, а па лбе такі добра зарабіў!..

Можа, хоць пасля гэтага мазгі ў яго на месца сталі: напэўна, будзе думаць, дзе каня навязваць і калі яго з пашы забіраць?

Аляксандр Матошка, *г.п. Расоны.*

ПРУТОК

Аднойчы наш тата адпачываў у санаторыі і, вярнуўшыся дадому, пачаў раздаваць падарункі:

— Гэта — табе!

— Гэта — табе!

— А гэта — табе! — сказаў ён і працягнуў мне... пруток. Самы што ні на ёсць звычайны.

Я скрывіла вусны: во, знайшоў падарунак...

— Гэта не просты пруток, — патлумачыў тады тата, — гэта — вінаградная лаза. Яе трэба пасадзіць у зямлю, паліваць вадзічкай. Яна прарасце, зазелянее, і праз год-другі ў нас будзе свой вінаград.

Навіна гэта ўсім спадабалася. Яшчэ б — свой вінаград!.. Але з чаго? Няўжо вось гэты сухенькі дубчык можа прарасці, зазелянець? Няўжо на ім вырасце смачны вінаград? У гэта неяк мала верылася, асабліва матулі. Ды яшчэ калі даведалася, што тата купіў гэты пруток аж за дзесяць рублёў...

І тым не менш мой падарунак быў урачыста пасаджаны ў вялікую кадку з-пад старога фікуса, а даглядаць яго даручылі мне.

Кожны дзень я старанна паліваю зямлю, а потым доўга разглядаю пруток. Я шукала на ім хоць якую-небудзь пупышачку, з якой мог бы паказацца зялёны лісток. Але нічога нават блізка падобнага на дубчыку не з'яўлялася. «Цікава, — аднойчы падумала, — вось я яго паліваю, паліваю, а ён, можа, і каранёў яшчэ не пусціў?»

Двума пальцамі хуценька пацягнула пруток з зямлі. Так і ёсць — каранёў ніякіх. Утыкнула дубчык назад і пальцамі зраўнавала зямлю.

Уначы я ўбачыла сон, быццам мой пруток зазелянеў, вырас пад самую столь, як наш стары фікус, і цяпер аж гнуўся пад цяжарам гронак вінограду.

Раніцай перш-наперш я пабегла да кадкі. «Ну, — думаю, — сёння карані ўжо дакладна выраслі!» Вырвала пруток — зноў нічога...

Цяпер кожны дзень пасля паліву я выцягвала пруток з зямлі, спадзеючыся ўбачыць вусы каранёў. Дзе там!..

Тата надта перажываў з-за гэтага, а маці толькі пад'юджвала:

— Ну, як жа... Захацеў, каб на гэтай палцы за дзесяць рублёў вінаграду нарасло!

Аднойчы, выцягнуўшы пруток і ўбачыўшы, што каранёў усё яшчэ няма, я ўжо хацела ўсадзіць яго зноў у кадку, як раптам над маёй галавой пачуўся сярдзіты голас бацькі:

— Што ты робіш?

— Я... я правяраю, выраслі карані ці не...

— І часта ты гэта робіш? — спытаўся бацька.

— Кожны дзень...

— Ну, вось, — закрычаў тата маме на кухню, — вось у чым тут справа! Не мог той чалавек мяне ашукаць! Я ж бачыў яго вінаград!

— Ну, а нам які толк з яго вінаграду? — сказала мама, заходзячы ў пакой. — Выкінь цяпер свой пруток на сметнік!

— Навошта ж яго выкідваць? — адказаў тата. — За яго грошы заплачаны. Ён яшчэ можа спатрэбіцца!

І шматзначна глянуўшы на мяне, тата выцягнуў пруток з зямлі і паклаў на шафу...

Тамара Бунта,
г. Мінск

РАЗМАЎЛЯЦЬ ТРЭБА ПРАВІЛЬНА!

Было гэта гадоў сорак таму, але ж актуальнасці, думаю, не страціла.

Адна з нашых дзяўчат паступіла вучыцца, паехала ў горад. Колькі там часу пажыла — прыязджае да бацькоў у вёску. Трэба ж праведаць ды харчоў з дому ўзяць — на стыпендыю не дужа разгуляешся.

Карацей, пагасціла яна, нешта дапамагла, збіраецца ад'язджаць. Маці ёй сумкі пакуе: і гэтага трохі палажыла, і таго... А потым кажа дачцэ:

— Дзіцятка, вазьмі кошычак, падскоч па драбіне на гарышча. Там цыбуля вісіць — ты ўбачыш. Прынясі крыху...

Госці б адразу паслухацца, а яна скрывілася, як той цыбулі з'еўшы, ды кажа:

— *Мама, ну как ты разговариваешь? Что у тебя за слова такие? Нужно говорить правильно: лестница, лук, чердак...*

Але ж ці мала пра што мамы гавораць дочкам, а дочкі — мамам. Як правіла, паміж імі ўсё і застаецца... Праўда, калі змест размоў на суд людскі не выносіць...

У тым выпадку гэта зрабіла дачка. Праз нейкую гадзіну-другую выйшла яна з дому, села ў аўтобус поруч са сваёю сяброўкай: едзе ў горад і расказвае — як быццам толькі ёй, але ж іншыя пасажыры таксама не глухія:

— *Представляешь, попрасила меня мама слазить на чердак за луком. Я залезла, в корзинку его набрала, только стала спускаться...* А драбіна з-пад ног як паедзе! Кошык з цыбуляй як бразнецца... І сама я ледзьве ўтрымалася... А то б пакалечыцца, мусіць, магла...

Не скажу дакладна, пасля гэтага выпадку ці не, але ў нас нарадзілася показка. Ва ўсіх, хто тры дні пажыў у горадзе, але ўжо «навучыўся» там «правільна» размаўляць, людзі сталі пытаць: «А ты што — за Перахрэсце выехаў і ўжо гарадскім стаў?»

Перахрэсце — гэта назва блізкага лесу. Як на чужы розум, дык і гэтае слова непрыгожае, «няправільнае». А як на наш — дык сваё, роднае. Як тое ж гарышча, драбіна, кошык і незлічоная безліч іншых.

Сяргей Ярмольчык,
в. Багданаўка, Лунінецкі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

■ Крымінал

Укралі попельніцу за 1,8 млн

У другой палове дня хлопец і дзяўчына зайшлі ў павільён аднаго са сталічных гандлёвых цэнтраў. А выйшлі з попельніцай коштам больш за 1,8 мільёна рублёў, ні аддаўшы за яе ні рубля...

Як паведамілі ў Цэнтральным РУУС г. Мінска, парачка знаходзілася ў павільёне не больш за 15 хвілін: разглядвала выстаўленую прадукцыю, кансультавалася з прадаўцом. Пакуль хлопец нібыта выбіраў падарунак, яго спадарожніца... правярала шуфляды стала, дзе знаходзілася каса. Не знайшоўшы там грошай, маладыя людзі пайшлі. А праз некаторы час прадавец заўважыла, што няма хрустальнай попельніцы коштам больш за 1,8 мільёна рублёў. Вось толькі зламыснікі не ўлічылі наяўнасць відэакамер у гандлёвай кропцы: цяпер іх шукае міліцыя.

Сяргей РАСОЛЬКА

Даты | Падзеі | Людзі

1766 год — нарадзіўся Жан Ларэй, французскі хірург, адзін з заснавальнікаў ваенна-палявой хірургіі. Удзельнічаючы ва ўсіх паходах Напалеона I, правёў поўную рэарганізацыю эвакуацыі параненых з поля бою і сістэмы іх лячэння. Упершыню арганізаваў палявыя лазарэты («амбулансы»), прапанаваў і практыкаваў раннюю ампутацыю канечнасцяў, шырока прымяняў трэпанацыю чэрапа, распрацаваў хірургію ваенных ран грудной клеткі.

1861 год — нарадзілася Магдалена Радзівіл, беларуская асветніца, мецэнатка. Шмат ахвяравала на дзяцей-сірот — адкрыла для іх шэраг прытулкаў. У сваіх вёсках арганізавала школы, стварыла таварыства цвярозасці, устанавіла студэнтам Віленскага і іншых універсітэтаў некалькі стыпендый. Але галоўнае месца ў дзейнасці Магдалены Радзівіл займала падтрымка першых беларускіх перыядычных выданняў. Яна апекавала выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца», «Нашу ніву»; на яе грошы былі выдадзены першыя кнігі Максіма Багдановіча і Канстанцыі Буйло. Памерла ў 1945 годзе.

1941 год — у баях пад Магілёвам быў цяжка кантужаны і захоплены ў палон Дзмітрый Карбышаў. Адхіліў прапанову гітлераўцаў аб супрацоўніцтве. Зверскі закатаваны (замарожаны жыўцом) у канцлагеры Маўтхаўзен. Герой Савецкага Саюза (пасмяротна). У Гродне Карбышаву пастаўлены помнік.

Было сказана

Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:

«Не шукай ты шчасця, долі
На чужым, далёкім полі...
Не шукай сабе, мой братку,
З ветрам Бацькаўшчыну-матку».

НАРОДЖАНЫЯ 7 ліпеня

Адкрыццё — галоўная тэма ў іх жыцці. Ім удаецца крануць самае патаемнае ў душах сваіх калег, родных і сяброў. Іх могуць лічыць дзівакамі, але іх арыгінальныя ідэі заслугоўваюць увагі. З імі цяжка ўжывацца, таму што яны патрабуюць вялікага разумення і цярплівасці ад сваіх партнёраў. Яны могуць быць бліскучымі выканаўцамі, але зрэдку здараецца, што з іх атрымліваюцца дэспаты і нават дыктатары, хоць пераважна гэта людзі з ярка выражанымі інстынктамі чалавекалюбства. Ім неабходна пераадолець імкненне прасякнуцца жалем да саміх сябе ў выпадку недаацэнкі грамадствам — рана ці позна іх усё ж такі ацэняць.

НАРОДЖАНЫЯ 8 ліпеня

Гэта ў найвышэйшай ступені прагматычныя людзі, здольныя не толькі стварыць тую ці іншую арганізацыю, сям'ю ці бізнес, але і забяспечыць іх нармальнае функцыянаванне. Некаторыя з іх цікавяцца рознымі філасофскімі ідэямі, але рэлігійныя аспекты не ўяўляюць для іх цікавасці. Ім удаецца прадставіць сябе як незалежных ва ўсім, аднак не трэба адкрыта дэманстраваць свой уплыў і фізічную прысутнасць, якая можа прыгнятаць больш далікатных індывідуумаў. Ім можна параіць асцерагацца прагнасці, жорсткасці, празмернай агрэсіўнасці, ганарыстасці і пагардлівасці.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.49	21.40	16.51
Віцебск	4.31	21.37	17.06
Магілёў	4.39	21.30	16.51
Гомель	4.45	21.17	16.32
Гродна	5.06	21.53	16.47
Брэст	5.16	21.45	16.29

Месяц

Першая квадра 5 ліпеня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Ефрасінні, Давыда, Мікалая, Пятра.*
К. *Альжбеты, Пракопа, Рыгора, Яўгена.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +28..+30°С	КІЕЎ +25..+27°С	РЫГА +25..+27°С
ВІЛЬНЮС +24..+26°С	МАСКВА +23..+25°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +20..+22°С

УСМІХНЕМСЯ

На экзамене студэнт Сідараў нечакана для сябе выцягнуў ваенны білет.

У бары.

— Мужыкі, сёння мне налівайце пабольш, а сабе паменш.

— Чаму?

— А сёння ваша чарга несці мяне дадому.

Удар па варотах! Мяч трапляе ў «дзявятку»! А вось і разгневаны кіроўца «дзяваткі»...

— Хто самы галоўны вораг пажарнага?

— Муха! Яна спаць перашкаджае!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.631. Індэкс 63850. Зак. № 2833.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 ліпеня 2014 года.